УДК 811.161.3'282(476.5)

Нацыянальная адметнасць найменняў іхтыя- і герпетафаўны Беларускага Паазер'я

Грачыха Т.А.
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск

Артыкул прысвечаны актуальным у айчынным мовазнаўстве пытанням даследавання такіх лексіка-семантычных груп, як іхтыялагічныя і герпеталагічныя намінацыі ў народных гаворках Беларускага Паазер'я.

Мэта артыкула – раскрыць спецыфіку функцыянавання народнай іхтыялагічнай і герпеталагічнай наменклатуры Беларускага Паазер'я як цэласнай сістэмы ў слоўнікавым складзе беларускай нацыянальнай мовы.

Матэрыял і метады. *Даследаванне пабудавана на аснове фактычнага матэрыялу, сабранага паводле дыялектных слоўнікаў і атласаў, а таксама ў час экспедыцыйных дыялекталагічных практык. Метады даследавання – апісальны, параўнальна-супастаўляльны і лінгвагеаграфічны.*

Вынікі і іх абмеркаванне. *У працы праведзена сістэматызацыя і класіфікацыя фактычнага матэрыялу паводле тыпаў супрацьстаўленых лексічных адрозненняў на прыкладах намінацый рыб, земнаводных і паўзуноў. Даследаваны лексіка-семантычныя асаблівасці дадзеных прадметна-тэматычных груп, разгледжаны праблемы варыянтнасці, сінаніміі, дублетнасці, аманіміі на аснове полінайменных радоў народнай іхтыялагічнай і герпеталагічнай наменклатуры Беларускага Паазер'я. Вызначана спецыфіка функцыянавання беларускай народнай фаўністычнай наменклатуры ў гаворках Віцебшчыны, выяўлены прычыны яе полінайменнасці ў параўнанні з літаратурнымі найменнямі і народнымі назвамі іншых гаворак Беларусі.*

Заключэнне. *Для народных іхтыялагічных і герпеталагічных намінацый Беларускага Паазер'я характэрна з'ява полінайменнасці. У гаворках назіраюцца тыя ж лексіка-семантычныя працэсы, што і ў агульналітаратурнай мове: сінанімія, варыянтнасць, полісемія, аманімія. Аналіз супрацьстаўленых адрозненняў прадстаўленых намінацый выяўляе семантычнае багацце і разнастайнасць слоў, указвае на іх спецыфіку і нацыянальную адметнасць.*

Ключавыя словы: *паўночна-ўсходні дыялект, групы гаворак, іхтыялагічныя намінацыі, герпеталагічныя намінацыі, супрацьстаўленыя лексічныя адрозненні, варыянтнасць, сінанімія, дублетнасць, аманімія.*

(Ученые записки. – 2022. – Том 35. – С. 143–147)

National Features of Ichthyological and Herpetological Names of Belarusian Lake District (Paazerye) Fauna

Grachykha T.A.
Education Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk

The article deals with current domestic linguistic issues, which are studies of such lexical and semantic groups as ichthyological and herpetological nominations in folk dialects of Belarusian Lake District (Paazerye).

The article aims at revealing the specificity of functioning of folk ichthyological and herpetological nomenclature of Belarusian Paazerye as an entire system in the vocabulary composition of the Belarusian national language.

Material and methods. *The research is based on factual material collected from dictionaries and atlases as well as during expedition dialectical practices. The research methods were the description, the comparative and the linguistic and geographical.*

Findings and their discussion. *Systematization and classification of factual material of types of opposing lexical differences based on the examples of fish, amphibians and reptiles are conducted in the paper. Lexical and semantic features of the above-mentioned object and thematic groups are studied; issues of variants, synonymy, doubling, homonymy on the basis of polyname gender of folk ichthyological and herpetological nomenclature of Belarusian Paazerye are considered. Specificity of functioning of Belarusian folk fauna nomenclature in dialects of Vitebsk Region is identified; Reasons of its polyname character compared to standard names and folk names of other dialects of Belarus are singled out.*

Conclusion. *Folk ichthyological and herpetological nomenclature of Belarusian Paazerye is of polyname character. Dialects are characterized by the same lexical and semantic processes as those in the standard language: synonymy, variants, polysemy, homonymy. The analysis of the opposing distinctions of the presented nominations demonstrates semantic richness and variability of words, identifies their specificity and national character.*

Key words: *north-eastern dialect, dialect groups, ichthyological nominations, herpetological nominations, opposed lexical distinctions, variant, synonymy, doubling, homonymy.*

(Scientific notes. – 2022. – Vol. 35. – P. 143–147)

Адрас для карэспандэнцыі: ***e-mail: gta5963980@mail.ru*** *– Т.А. Грачыха*

Вызначэнне асаблівасцей функцыянавання беларускай народнай фаўністычнай наменклатуры ў гаворках Беларускага Паазер'я, якія адносяцца да паўночна-ўсходняга дыялекту, з'яўляецца актуальнай задачай для вырашэння праблем беларускай дыялекталогіі. Даследаванне народных найменняў рыб, земнаводных і паўзуноў Беларускага Паазер'я дазваляе выявіць іх спецыфіку, нацыянальную адметнасць, вызначыць дыялектныя ўласналексічныя, лексіка-фанетычныя, лексіка-марфалагічныя, лексіка-семантычныя супрацьстаўленыя дыялектныя адрозненні, сінанімію і варыянтнасць, а таксама прычыны разнастайнасці і адрозныя асаблівасці гэтых намінацый у параўнанні з літаратурнымі найменнямі і народнымі назвамі іншых гаворак Беларусі.

Іхтыялагічныя і герпеталагічныя намінацыі беларускіх гаворак з'яўляюцца састаўной часткай лексічнай сістэмы дыялектнай мовы. Назвы іхтыя- і герпетафаўны ўтвараюць асобныя тэматычныя і лексіка-семантычныя групы заалагічнай лексікі, уваходзяць у склад беларускай народнай іхтыялагічнай і герпеталагічнай наменклатуры.

Пачынаючы з 2-й паловы XX ст. беларускімі дыялектолагамі было выдадзена шмат рэгіянальных слоўнікаў. Фактычны матэрыял па заалагічнай лексіцы ў асноўным занатаваны ў грунтоўных акадэмічных лексікаграфічных і лінгвагеаграфічных працах: "Агульнаславянскі лінгвістычны атлас", "Лексічны атлас беларускіх народных гаворак", "Жывёльны свет: Тэматычны слоўнік", "Лексічныя ландшафты Беларусі: Жывёльны свет". Дыялектолагамі праведзена значная работа па збіранні і вывучэнні заалагічнай лексікі Беларусі, асабліва лексікі Палесся. Так, да праблем рыбалоўнай лексікі звярталіся ў сваіх працах А.А. Крывіцкі, А.Я. Баханькоў, І.Я. Яшкін і інш. Між тым Беларускае Паазер'е мае спецыфічныя адметнасці ў заагеаграфічным і лінгвагеаграфічным планах.

Мэта артыкула – раскрыць спецыфіку функцыянавання народнай іхтыялагічнай і герпеталагічнай наменклатуры Беларускага Паазер'я як цэласнай сістэмы ў слоўнікавым складзе беларускай нацыянальнай мовы.

Матэрыял і метады. Даследаванне пабудавана на багатым фактычным матэрыяле, сабраным паводле дыялектных слоўнікаў і атласаў, а таксама ў час экспедыцыйных дыялекталагічных практык. Лексіка інтэрпрэтуецца праз скарыстанне апісальнага, параўнальна-супастаўляльнага і лінгвагеаграфічнага метадаў.

Вынікі і іх абмеркаванне. Беларускае Паазер'е (Падзвінне) – гэта фізіка-геаграфічны і гісторыка-этнаграфічны рэгіён, размешчаны на поўначы Беларусі, да якога адносіцца Віцебшчына, паўночныя раёны Міншчыны і Гродзеншчыны [1, с. 255]. Народныя гаворкі Падзвіння ўваходзяць у паўночна-ўсходні дыялект беларускай мовы, у якім вылучаюць заходнюю (полацкую) і ўсходнюю (віцебска-магілёўскую) групы.

Даследаванне народнай іхтыя- і герпетанаменклатуры Паазер'я паказала, што асаблівасці фаўністычнай лексікі рэгіёна адпавядаюць асаблівасцям груп гаворак, зон паўночна-ўсходняга дыялекту.

Так, для назваў жывёл заходняй Віцебшчыны (полацкая група гаворак) характэрна недысімілятыўнае аканне (яканне): *мянёга* 'мінога' мёр., глыб.; *ляпе́нь* 'харыус' докш.; *кару́шка* 'корушка' мёр.; *сляпе́ц* 'галец' ушац., леп., шарк., мёр.; *лягéнь* 'шчыпоўка' чаш., глыб.; *апралёўка* 'шчупак' глыб.; *сляпа́к* 'верацэнніца' астр.; *я́шчараца* 'яшчарка' глыб. і інш. З другога боку, характэрна дысімілятыўнае аканне (яканне): *змія́* 'гадзюка' брасл., мёр.; *я́шчырыца* 'яшчарка' шарк., глыб., мёр., рас.; *уклія́* 'верхаводка (укляя)' пол.; *гусьцірá* 'гусцяра' пол. [2; 3]. Характэрна цвёрдая фанема /р/: *вуго́рыч* 'вугор' глыб., брасл.; *ласку́рына* 'гусцяра' глыб.; *вугры́ца* 'мінога' чаш.; *фарэ́лька* ж. 'стронга (фарэль)' беш.; *трыто́н* 'трытон' пол., шарк., глыб., мёр., брасл., в.-дзв., рас.; *я́шчырыца* 'яшчарка' шарк., глыб., мёр., рас. [2; 3]. Сустракаюцца формы на -а (-я) сярод варыянтаў з адрознымі формамі роду: *вужáка* 'вуж' аг.-вяд. – *вужáк (ужáк)* 'тж' ашм., мядз.; *цéрах* м. 'гусцяра' глыб. – *цераха́* ж. 'тж' пол.; *карп* м. 'карп' аг.-вяд. – *кáрпа* ж. 'тж' глыб., пол. – *кáрпа* м. арш. [2; 3].

Для найменняў фаўны ўсходняй часткі Віцебшчыны характэрна дысімілятыўнае аканне, а таксама дысімілятыўнае яканне віцебскага тыпу: *сілáва* 'рапушка' беш.; *мінту́з* 'мянтуз' лёзн., пол.; *піскáр* 'пячкур' шум., беш., тал.; *змія́* 'гадзюка' гар., віц., лёзн., шум. і інш. Таксама ўласціва адрозніванне цвёрдай і мяккай фанем /р/, /р'/: *жэ́ріх* 'жэрах' гар.; *ря́пушка* 'рапушка' шум.; *ву́гарь* 'вугор' гар.; *я́шчыріца* 'яшчарка' лёзн.; *трітóн* 'трытон' гар., але *трытóн* 'тж' гар., віц., беш., сен. [2; 3].

У гаворках паўночна-ўсходняга дыялекту пашырана поўнае аканне: *вугóрач* 'вугор' глыб.; *шчы́паўка* 'шчыпоўка' сен.; *галавáч* 'падкаменшчык' гар., беш., сен., шарк., мёр., глыб. і інш. [2].

Уласцівы пратэтычны [в] перад пачатковымі націскнымі [о], [у]: *вуж* 'вуж' аг.-вяд., але *уж* 'тж' віц., шум., сен., арш., лёзн., чаш., мёр., глыб., рас., в.-дзв.; *вóкунь* 'акунь' аг.-вяд.; *ву́гар* 'вугор' беш., сен., арш., тал., пол., леп., докш.; *вóбла, вóбліца* 'плотка' сен., беш., шарк., глыб., мёр. [2].

Сустракаюцца элементы цокання: *чарóха* 'гусцяра' арш. [4, с. 215], але *цераха́* 'гусцяра' пол., *цéрах* 'тж' глыб. [2].

Назіраюцца працэсы асіміляцыі: *сліш* 'пячкур' беш., сен.; *вуш* 'гадзюка' чаш.; *гат* 'гадзюка'і 'вуж' гар., арш., в.-дзв., мёр. [2].

Назвы маладых істот на -онак (-ёнак), пашыраныя пад уплывам рускай мовы ў гаворках паўночна-ўсходняга дыялекту, вельмі рэдкія сярод найменняў іхтыя- і герпетафаўны: *шчурóнак* 'дзіцяня шчупака' Слабодка Леп.; *лягушóнак* 'дзіцяня жабы' Літвякі Беш., Смалоўка Гар., Асінаўка Дубр., але *жабяня́тка* 'тж' Доўгае Докш. У дадзеных тэматычных групах

семантычная прыкмета паводле ўзросту не з'яўляецца вызначальнай. Але яна пашырана сярод найменняў тэрыяфаўны: *бабрёнак* 'дзіцяня бабра' Бунцікі Шум., Прудняки Гар., Стайкі Віц., Чарнаручча Лёзн., Слабодка Дубр.; *зайчанёнак* 'дзіцяня зайца' Пальмінка Гар., Мішкавічы Шум., Луг Беш., Града Сен., Пагосцішча Лёзн., Манякова Мёр., Леснікі Глыб. і інш. [2].

Гісторыка-геаграфічны і этнаграфічны пласты таксама паўплывалі на фаўністычны склад лексікі Беларускага Паазер'я. Суседства Паазер'я з этнічнымі тэрыторыямі Расіі, Латвіі, Літвы дазваляе гаварыць аб узаемапранікненнях лексем і запазычаннях. Напрыклад: *налі́м* 'мянтуз' шум., гар., віц., сен., шарк., леп., глыб., брасл. і інш., параўн. рус. *налі́м*; *піска́р* 'пячкур' беш., ушац., рас., глыб. і інш., параўн. рус. *песка́рь*; *вя́гла* 'мянтуз' глыб., паст., параўн. літоўск. *vegele* 'тж', *сліж* 'галец' пол., ушац., сен., параўн. літ. *slizys*, *sliziukas* 'тж'; *курме́ль* 'пячкур' беш., шарк., глыб., мёр. і інш., параўн. літоўск. *kurmtis* 'рыцца' і г.д. Уплыў польскай мовы таксама назіраецца ў заалагічнай лексіцы Паазер'я: *ліпе́нь* 'харыус' шарк., мёр., сен., *ліпе́ц* 'харыус' пол., параўн. польск. *lipień, lipiec* 'тж'; *вэ́нгош* 'вугор' брасл., *параўн.* польск. *wegorz* 'тж'; *ке́лба* 'пячкур' арш., *кялбо́к* 'пячкур' паст., параўн. польск. *kielb*, літоўск. *kielbas*, *kilbunas* 'тж' [5–7].

Для сінанімічных радоў фаўнанайменняў Паазер'я характэрны мнагачленныя супрацьстаўленыя адрозненні, якія ўключаюць не два, а болей слоў. Напрыклад: *вераце́нніца* – дыял. *вераце́нка* – *вераця́нка* – *вераце́ніца* – *вераце́нь* – *слі́вень* – *слема́к* і г.д. Так, у 82 населеных пунктах адзначана полінайменнасць у абазначэнні пэўных відаў іхтыяфаўны: *фарэ́ль* – *стронг* 'стронга (фарэль)' Слабада Шум.; *налі́м* – *кале́ка* 'мянтуз' Ходцы Сен.; *во́бліца* – *пло́тка* 'плотка' Далгінава Мёр. [2].

Шматлікая дублетнасць іхтыялагічных і герпеталагічных намінацый звязана з багатымі словаўтваральнымі магчымасцямі дыялектнай мовы, з народнай этымалогіяй у намінацыі жывёл, з узаемадзеяннем гаворак паміж сабой і літаратурнай мовай, з захаваннем старажытных лексем і запазычваннем з памежных гаворак: *мянту́з* – *мень* – *кале́ка* – *вяга́ла* – *налі́м* 'мянтуз', *быстра́нка* – *сіня́ўка* – *страка́тка* – *пі́сар* 'быстранка', *трыто́н* – *вадзяна́я я́шчарыца* – *лягу́шка* 'трытон' [2; 3].

Прычыны ўзнікнення шматлікіх фанетычных варыянтаў звязаны са з'явай асіміляцыі: *сліж* – *сліш* 'галец', *стаўбе́ц* – *стаўпе́ц* 'ялец', *язь* – *ясь* 'язь', *вуж (уж)* – *вуш (уш)* 'вуж'; са з'явай дысіміляцыі: *стро́нга* – *стро́мга* 'стронга (фарэль)', *громш* – *кроўж* 'уюн', *слі́вень* – *слі́пень* 'вераценніца', *вужа́ка* – *вуша́ка* 'вуж'; з мэтатэзай: *кара́сь* – *акра́сь* 'карась'; з эпентэзай: *карп* – *ко́рап* 'карп'; з пратэзай: *стронг* – *пстронг* 'стронга (фарэль)', *сты́нка* – *усты́нка* 'корушка', *язь* – *вязь* 'язь', *уклея́* – *вукля́* 'верхаводка (укляя)', *гусцяра́* – *усцяра́* 'гусцяра'; з адпадзеннем гукаў: *вуса́ч* – *уса́ч* 'вусач', *вуго́р* – *уго́р* 'вугор', *вужа́ка* – *ужа́ка* 'вуж' і 'гадзюка', *вуж* – *уж* 'вуж' [2; 3].

Фанетычныя варыянты адрозніваюцца галоснымі: *рапу́шка* – *ряпу́шка* 'рапушка', *ліпе́нь* – *ляпе́нь* 'харыус', *платва́* – *пло́тва* 'плотка', *вераце́нка* – *вераця́нка* 'вераценніца', *я́шчарка* – *я́шчурка* 'яшчарка', *трыто́н* – *трито́н* 'трытон'; зычнымі: *гарку́ша* – *гарьку́ша* 'гальян', *лінь* – *лін* – *лень* 'лінь', *вуж* – *вуш* 'вуж'; галоснымі і зычнымі: *ажгу́р, джгур, яжту́р, ужгу́р, яджгу́р, ячгу́р, яжгу́р* 'джгір (ёрш)'; камбінацыяй фанем: *кара́сь* – *крась* – *акра́сь* 'карась' [2; 8, с. 255].

Акцэнталагічная неўнармаванасць дыялектнай мовы садзейнічае ўтварэнню шматлікіх акцэнтных і акцэнтна-фанематычных варыянтаў: *у́грыца* – *вугры́ца* 'мінога', *ра́ушка* – *ряпу́шка* 'рапушка', *ліпень* – *ліпе́нь* 'харыус', *сты́нак* – *стыно́к* 'корушка', *ко́люшка* – *калю́шка* 'колюшка', *я́шчурка* – *яшчу́рка* 'яшчарка' [2; 3].

Багацце словаўтваральных магчымасцей народных гаворак, сінанімічнасць словаўтваральных сродкаў, узаемадзеянне розных словаўтваральных тыпаў і ўтваральных асноў ствараюць разнастайнасць лексіка-марфалагічных адрозненняў найменняў жывёл. Сярод іхтыялагічнай і герпеталагічнай народнай наменклатуры выяўлена невялікая колькасць варыянтаў з адрознымі формамі роду: *вя́гела* ж. – *вя́гел* м. 'мянтуз', *стро́нга* ж. – *стронг* м. 'стронга (фарэль)', *галаве́нь* м. – *галаўня́* ж. 'галавень', *вужа́ка* ж. – *вужа́ка* м. 'вуж' і 'гадзюка' і інш. [2; 3].

Сярод лексіка-марфалагічных адрозненняў найбольшую колькасць утвараюць аднакаранёвыя сінонімы. Так, адзначаны адзінкавыя словы аднаго кораня з рознымі прэфіксамі: *пад'я́зь* 'дробны язь', *паду́ст* 'падуст' (ад рус. уста). Аднакаранёвыя словы з рознымі суфіксамі і прэфіксамі таксама нешматлікія: *падукле́йнік* 'верхаводка (укляя)', *паткаме́ншчык (паткаме́ньчык)* 'падкаменшчык', *пад'ёршык* 'дробны ёрш', *пад'язо́к* 'ялец', *пад'язе́ц, пад'я́зік* 'дробны язь', *падле́шчык, падле́шык, паўле́шык* 'невялікі лешч' [2; 3]. Прэфіксальны і прэфіксальна-суфіксальны спосаб утварэння ў асноўным характарызуюць прадстаўнікоў іхтыяфаўны паводле ўзросту, указваючы на іх меншыя памеры ў параўнанні з дарослымі асобінамі. Дадзеныя спосабы ўтварэння не выяўлены сярод найменняў герпетафаўны.

Сярод аднакаранёвых сінонімаў пераважаюць словы аднаго кораня з рознымі суфіксамі, якія могуць мець значэнне зборнасці: *платва́ (пло́тва)* 'плотка', *паду́ства* 'падуст'; памяншальна-ласкальнае значэнне: *гусцёрка* 'гусцяра', *яршо́ц* 'дробны ёрш', *я́льчык* 'ялец', *слі́жык* 'уюн', *клянёк* 'ялец', *гала́ўлік* 'галавень', *я́зік, язёк* 'дробны язь', *курмялёк, кялбо́к, ко́блік* 'пячкур', *шчуро́нак* 'малы шчупак' і інш.; значэнне адзінкавасці: *платві́на* 'плотка', *ласку́рына* 'вялікая гусцяра', *вуго́рыч* 'вугор' і інш.; значэнне экспрэсіўнасці, іранічнасці: *гарба́ч, гарбы́ль* 'акунь', *сліжня́к* 'галец', *бялю́га* 'жэрах' і г.д. [2; 3].

Паводле прадуктыўнасці суфіксы займаюць розныя пазіцыі ў вызначаных прадметна-тэматычных групах. Для паазерскай народнай іхтыянаменклатуры

найбольш прадуктыўнымі з'яўляюцца суфіксы -аўк(а) (з адпаведнымі варыянтамі) і -к(а). Для герпетанаменклатуры – суфіксы -іц(а) (з адпаведнымі варыянтамі), -к(а). Напрыклад: *краса́ўка* 'краснапёрка', *шчы́паўка* 'шчыпоўка', *страка́тка* 'быстранка', *гусцёрка* 'гусцяра', *укле́йка* 'укляя', *верацяні́ца* 'вераценніца', *часно́чніца* 'часночніца, *я́шчарыца* 'яшчарыца' і інш. [2; 3]. Наогул, у працэсе дэрывацыі ўдзельнічаюць самыя разнастайныя суфіксы: - ачк(а), - аль, - ец, - ок, - ач, - ень, - ік, - ух(а), - ар, - ушк(а), - ін(а), - ак, - анк(а), - чык, - уш(а), - онак, - ат(а), - няк, - ун, -ук, -ізн(а), - ест, - із(а) і інш.

У адрозненне ад навуковай наменклатуры, з характэрным для яе абавязковым адлюстраваннем рода-відавых адносін, народная герпета- і іхтыялагічная наменклатура ў асноўным указвае на родавае найменне, а не на відавое. У сувязі з гэтым народныя назвы рыб, земнаводных, паўзуноў паводле сваёй структуры з'яўляюцца простымі словамі: *санда́ч* 'судак', *калю́чка* 'колюшка', *вя́гела* 'мянтуз', *шчыпа́ч* 'шчыпоўка', *пястру́шка* 'стронга (фарэль)', *я́шчыріца* 'яшчарка', *лягу́шка* 'жаба' і г.д. Выпадкі ўтварэння слоў спосабам асновескладання з суфіксацыяй нешматлікія: *верхапла́ўка* 'аўсянка (вярхоўка)', *краснапёрка, краснапёра, краснакры́лка*, *краснаво́чка, краснапярэ́ц, краснагла́зка* 'краснапёрка', *жаўтапу́зік* 'вераценніца' і інш. Адзначаны ў народнай наменклатуры іхтыя- і герпетафаўны Паазер'я словазлучэнні рода-відавога характару: *кара́сь бе́лы*, *кара́сь залаці́сты, прасты́ кара́сь* 'карась', *я́завая пло́тка* 'дробны язь', *ры́ба-ба́ба* 'падкаменшчык', *вадзяна́я жа́ба і жарла́ ядаві́тая* 'жарлянка чырванабрухая', *жа́ба паро́сная* 'рапуха чаротная', *жа́ба шэ́рая* 'рапуха шэрая', *вадзяна́я я́шчарка і вадзяна́я я́шчарыца* 'трытон', *я́шчарка-вераце́нніца* 'вераценніца' і інш. [2; 3]. Падобныя ўтварэнні вядомы і іншым гаворкам Беларусі: *балаця́ная жа́ба, сі́няя жа́ба* 'жаба', *кара́вая жа́ба*, *земляна́я жа́ба* 'рапуха' і інш. [9]. Спосаб утварэння словазлучэнняў тэрміналагічнага характару ў народнай наменклатуры жывёл не вызначаецца такой прадуктыўнасцю, як у навуковай фаўнанаменклатуры.

Лексіка-семантычныя адрозненні народных фаўністычных найменняў узнікаюць з прычыны падабенства некаторых відаў рыб, земнаводных, паўзуноў паміж сабой. У дадзеным выпадку можна гаварыць пра іх магчымае нераспазнаванне носьбітамі народных гаворак. Напрыклад, *вужа́ка* 'вуж' і 'гадзюка'; *гат* 'гадзюка' і 'вуж', 'змяя'; *платва́* 'плотка' і 'падлешчык'; *пад'я́зік* 'невялікі язь' і 'падлешчык'; *круме́ль* 'гальян' і 'пячкур'; *курме́ль* 'пячкур' і 'ёрш'; *усцяра́* 'гусцяра' і 'падлешчык'; *пласку́рка* 'падлешчык' і 'гусцяра'; *саза́н* 'сазан амурскі' і 'карп'; *сліж* 'галец' і 'уюн'; *кілба́ч* 'галец' і 'пячкур' і інш. [2; 3].

Абмежаванне рэсурсаў мовы і імкненне ўжываць словы з празрыстай унутранай формай, якая ўтрымлівае яркі канкрэтны вобраз, таксама садзейнічае ўтварэнню на аснове пераасэнсавання метафарычных і метанімічных найменняў, што ўзніклі ў выніку моўнай аманіміі і полісеміі лексіка-семантычным спосабам. Перанос якасцей, асаблівасцей з прадметаў, аб'ектаў жывога і нежывога свету на прадстаўнікоў фаўны надае народнай заалагічнай наменклатуры выразнасць, часам эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку: *галава́ч* 'падкаменшчык', *су́чка* 'шчыпоўка', *куса́ка* 'шчыпоўка' і інш. Метафарычныя пераносы найменняў адбываюцца на аснове падабенства знешніх адзнак: *вуса́ч* 'вусач' і 'сом'; *паўзу́н* 'рапуха' і 'паўзун'; *гарбы́ль* 'карась' і 'акунь'; *бычо́к* 'падкаменшчык' і 'дзіцяня каровы'; *калю́чка* 'колюшка' і 'ёрш'; *кале́ка* 'мянтуз' і 'пакалечаны чалавек'; *каза́* 'шчыпоўка' і 'жывёла'; *рага́тка* 'колюшка трохіголкавая' і 'невялікая драўляная развіліна' і інш. Назіраецца метафарычны перанос паводле колеру: *мангóл* 'карась залаты' і 'прадстаўнік насельніцтва Манголіі'; *цыга́нка* 'гальян' і 'прадстаўнік цыганскага народа'; *стрыказа́* 'падкаменшчык' і 'насякомае'; *бялу́га* 'жэрах' і 'бялуга'; паводле смакавых якасцей: *гарку́ша* 'гарчак' і 'гальян'; паводле памераў і формы прадметаў: *маля́ўка* 'аўсянка' і 'маленькая рыбка, якая нядаўна выйшла з ікры'; *фане́ра* 'лешч' і 'тонкія драўляныя пласціны'; *скавaро́днік* 'акунь сярэдніх памераў', *скавaро́дніца* 'шчупак сярэдніх памераў'(паводле сваіх памераў якраз памяшчаюцца на патэльні) і рус. *сковорода́* 'патэльня'; паводле паводзін і функцый: *су́чка* 'шчыпоўка' і 'самка сабакі'; *баро́метр* 'уюн' і 'прыбор для вымярэння атмасфернага ціску'; *чыраўні́ца, чырадзе́йка* 'рапуха' і 'жанчына'; *ваўчо́к* 'колюшка', 'падкаменшчык', 'ёрш ' і 'дзіцяня ваўка'; паводле гукаперайманння: *крумка́ч* 'жаба' і 'птушка крумкач'; *піску́н* 'уюн' (з піскам заглынае паветра) і 'птушка рабіннік' Бунцікі Шум., Першамайка Гар., Ходцы Сен., Язна Мёр. [2].

Наогул, матываваных найменняў сярод народнай іхтыя- і герпетанаменклатуры прыкладна на 30% больш, чым нематываваных. Сярод матываваных лексем вылучаюцца разнастайныя семантычныя мадэлі ўтварэння. Напрыклад, паводле колеру: *сіня́ўка, страка́тка* 'быстранка'; *пястру́шка* 'стронга (фарэль)'; *красну́ха* 'рапуха'; паводле месца пражывання: *падкаме́ньчык* 'падкаменшчык'; *верхаво́дніца, верхапла́ўка, верхаво́дзь*, *павярхо́ўка* 'верхаводка (укляя)'; паводле спосабу прымянення: *халаду́шка* 'жаба, якой ахаладжвалі малако'; паводле памераў цела: *даўга́р* 'вугор'; паводле часу нерасту (метанімічны перанос па часавай сумежнасці): *апралёўка, марцо́ўка* 'шчупак'; паводле паху: *часно́чніца* 'часночніца'; паводле гукаперайманння: *ку́каўка* 'жарлянка'; *квaку́ха, квaку́шка* 'жаба'; *жу́жалка* 'жаба'; паводле паводзін: *шчыпа́ч, ляге́нь, куса́ка* 'шчыпоўка' і г.д. [2; 3].

Як бачна з прааналізаванага матэрыялу, для народнага словаўтварэння вызначаных лексіка-семантычных груп выкарыстоўваюцца дэрывацыя, складанне, сінтаксічны і лексіка-семантычны спосабы ўтварэння.

Заключэнне. Такім чынам, лексічны склад жывёльнага свету Падзвіння вызначаюць розныя аспекты: групы і падгрупы гаворак, дыялектныя зоны, этнаграфічны склад яго насельніцтва, уплыў памежжа.

Таму, нягледзячы на пэўную розніцу заалагічнай дыялектнай лексікі ўсходняга і заходняга Паазер'я (у асноўным на фанетычным узроўні), нельга гаварыць аб ясна акрэсленых арэалах. Лексіка Падзвіння ўяўляе сабой адзіны арэал з узаемнымі мазаічнымі ўкрапленнямі кожнай з груп гаворак, дыялектных зон Паазер'я, адпавядае моўным асаблівасцям паўночна-ўсходняга дыялекту.

Узаемадзеянне гаворак паміж сабой і літаратурнай мовай, вусная форма бытавання дыялектнай мовы садзейнічаюць развіццю варыянтнасці і дублетнасці фаўністычных найменняў Паазер'я. Калі ў тэрміналогіі варыянтнасць – з'ява непажаданая, то яе пашыранасць на дыялектным узроўні гаворыць пра багацце і самабытнасць народнай мовы. Наяўнасць варыянтаў указвае на сістэмныя сувязі ў лексіцы гаворак. Лінгвагеаграфічная характарыстыка беларускіх заалагічных назваў дазваляе гаварыць аб лексемах-адпаведніках на дыялектным узроўні ў розных гаворках і мовах, аб узаемапранікненні лексем праз гаворкі памежжа, дае магчымасць убачыць багацце і разнастайнасць фаўністычнай лексікі Беларускага Паазер'я.

Скарачэнні раёнаў

Арш. – Аршанскі, астр. – Астравецкі, ашм. – Ашмянскі, беш. – Бешанковіцкі, в.-дзв. – Верхнядзвінскі, віц. – Віцебскі, гар. – Гарадоцкі, глыб. – Глыбоцкі, докш. – Докшыцкі, дубр. – Дубровенскі, леп. – Лепельскі, лёзн. – Лёзненскі, мёр. – Мёрскі, Мядз. – Мядзельскі, паст. – Пастаўскі, пол. – Полацкі, рас. – Расонскі, сен. – Сенненскі, тал. – Талачынскі, уш. – Ушацкі, чаш. – Чашніцкі, шарк. – Шаркаўшчынскі, шум. – Шумілінскі.

Літаратура

1. Геаграфія Беларусі: энцыкл. даведнік. – Мінск: БелЭн, 1992. – 381 с.
2. Грачыха, Т.А. Дыялектны тэматычны слоўнік іхтыя- і герпетафауны Беларускага Паазер'я / Т.А. Грачыха. – Віцебск: Выдавецтва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2006. – 31 с.
3. Жывёльны свет: тэматычны слоўнік / склад. В.Д. Астрэйка [і інш.]; рэд. Л.П. Кунцэвіч, А.А. Крывіцкі. – Мінск, 1999. – 239 с.
4. Яшкін, І.Я. Семантыка назваў рыбалоўства ў гаворках пяшчанцаў Слаўгарадскага раёна / І.Я. Яшкін // З жыцця роднага слова. Лексікалагічны зборнік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1968. – С. 119–132.
5. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча: у 5 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979–1986.
6. Лексічныя ландшафты Беларусі: жывёльны свет / навук. рэд. Ф.Д. Клімчук, І.Я. Яшкін. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 252 с.
7. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / склад.: Г.К. Семянькова, Т.А. Грачыха, А.С. Дзядова [і інш.]; пад рэд. А.С. Дзядовай. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2014. – Ч. 2. – 358 с.
8. Баханькоў, А.Я. З рыбалоўнай лексікі Полаччыны / А.Я. Баханькоў // З народнага слоўніка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – С. 218–225.
9. Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: у 5 т. – Мінск: Фонд фундаментальных даследаванняў РБ, 1993. – Т. 1: Раслінны і жывёльны свет / Г.У. Арашонкава, М.В. Бірыла, А.П. Груцо [і інш.]; рэд. М.В. Бірыла; Ю.Ф. Мацкевіч. – 160 с., 368 карт.

Паступіў у рэдакцыю 25.04.2022